БЕЛАРУСЬ

Штадзенная політычна-эканамічная і літэратурная газэта

пад агульным кіраўніцтвам Язэпа Лёсіка.

ГОД ВЫДАНЬНЯ II.

Падпіска на 1 м-ц з перасылкай 45 мар.

АБВЕСТКІ: на 4-й стран. прым. ва ўсіх ... на 5 м. за рад. пэтыту

Газэта выходзіць штодня, апроч дзён пасьвяточных.

Рэдакцыя і Кантора: Менск, вул. Міцкевіча, Беларускі Дом (б. Юбілейны).

Рэдактар прыма ... 12—1 гадз. Кантора адчынена ад 9 да 3 гадз.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і з адрэсам аўтора.

Аплата прынятых рукапісаў залежыць ад рэдакцыі.

Рукапісы назад не вываюцца.

ЦАНА НУМАРУ 3 МАРК.

№ 131 (187). Менск, Нядзеля 20 чэрвеня 1920 г. № 131 (187).

Паведамленьне Гэнэральнага Штабу Польскіх Войскаў.

Ад 18—VI.

На паўночным фронце прадаўжаецца актыўная дзеяльнасьць разьведчыкаў. Нашые аддзелы, посьле упартага бою, занялі на ўсходнім беразе р. Аўты м. Сакалоўшчыну.

У райёне Навасёлак і Бярэзіны нашы патрулі зьнішчылі два масты, наведзеные ворагам у час апошняга наступленьня.

На Палесьсі вораг перайшоў у энэргічнае наступленьне.

На лініі Крамлёўка—Чэравач прадаўжаюцца ўпартые баі.

На Украіне ўчарашні дзень прайшоў спакойна.

1 Замясьціцель шэфа Гэнэральнага Штабу
Кулінскі,
Гэнэрал-падпаручнік.

Польска-літоускіе адносіны і Беларусь.

Віленская польская газэта „Наш Край“ перадае, што сказалі літоўскіе політыкі польскім дэпутатам Сойму М. Недзялкоўскаму і проф. Камянецкаму.

Газэта гэтак перадае гэтые размовы з пасламі М. Недзялкоўскім і проф. Камянецкім.

„Найбольш цікавым для нас пытаньнем была справа ўзаемных адносін паміж Літвою і Польшчай. На гэтую тэму мы мелі цэлы рад гутарак.

— Ці, певне, можаце мяе выясьніць пагляды паасобных груп на гэтую справу?

Пасол Недзялкоўскі прадставіў пагляды літоўскіх груп у справе адносін паміж Літвою і Польшчай у гэтакіх словах:

Найпрыхільней да нас адносіцца соц.-дэмакратыя. Яе правадыры п.п. Венслаўскі і Кайрыс сказалі, што вялікая Літва, занімаючая Вільню, Коўну і Менск, ёсьць утопія. Літоўская рэспубліка ў програме соцыяль-дэмакратыі абнімае Коўну і Вільню. Ладу гэтай рэспублікі партыя не вырашае; не выключаецца аднак магчымасьць кантональнага ладу, паскольку-б гэтага хацела сабе Вільня. Фэдэрацыі з Польшчай партыя гэтак сама не адкідае. Калі-б да улады ў Польшчы дайшлі элементы левые, то польска-літоўская фэдэрацыя знайшла-б у Літве шмат прыхільнікоў. Цяперашні літоўскі урад партыя разглядае, як урад par exelence рэакцыйны. Што да горада Вільні, то партыя згаджаецца на тое, каб гэтую справу вырашыць ці то дарогаю плебісцыту, ці то праз канстытуанту. І ў першым, і ў другім выпадку голас Беларусі выключаецца. Літоўскіе соц.-дэмакраты гатовы гаварыць аб практычным зьдзейсьненьні гэтай програмы з П. П. С.

Левые літоўскіе эсэры, лідэрам каторых ёсьць былы пасол у расійскую думу Яноўшкевіч, становяць партыю невялікую і цяпер праследуюцца урадам. Партыя гэта, каторая стаіць на грунце *саветаў*, адносіцца аднак варожа да расійскіх бальшавікоў і не верыць у паўную незалежнасьць Літвы. Фэдэрацыю Літвы з якою нібудзь суседняй дзяржаваю партыя лічыць за канечна патрэбную. З якою?—гэта залежыць ад таго, каторая з суседніх дзяржаў будзе мець найдэмакратычнейшы лад. Справу Вільні партыя левых эсэраў хацела-б разьвязаць дарогаю плебісцыту працоўнага народу.

Соцыялісты народнікі, сьпісла бяручы сялянскую партыю Сьляжэвіча і Грынкуса, лічаць, што з усіх комбінацый прынцыпова выключыць трэба Беларусь. Вільня павінна быць часьцю Літвы і гэты постулят не можа падлягаць ніякаму сумленьню. Фэдэрацыя з Польшчай цяпер не на часе. Можа можна будзе аб ёй гаварыць год за 30—40. Цяпер сытуацыя, магчыма, што зьменіцца. Справу Вільні, паскольку палякі не вераць ёе літоўцам, разьвяжа інтэрвэнцыя коаліцыі, каторая бяз сумленьня выпадзе на карысьць Літвы.

Хрысьціянская дэмакратыя, лідэрам каторай ёсьць ксёндз Круповіч, складаецца з трох арганізацый: 1) з уласьцівай хрысьц. дэмакратыі, 2) фэдэрацыі працы (работніцкая арганізацыя) і 3) з сувязі сельскіх гаспадароў. Усімі гэтымі групамі кіруюць ксяндзы і маюць гэтакую політычную програму: Граніцы Літвы павінны даходзіць на паўночы ўсход па Лібаву; праходзячы берагам Балтыкі, павінна абнімаць усю прускую Літву, потым павінны ісьці ўздоўж граніц б. Конгрэсоўкі (абнімаючы Саколку, Бельск і Брасьце), а на ўсходзе лінія мае праходзіць паміж Маладэчнам і Менскам, прычым, найбольш высунутым пунктам павінен быць належачы да Літвы Дынабург. Ад гэтых этнографічных(?) граніц партыя схіляецца зрабіць вельмі невялікіе ўступкі на карысьць Польшчы (напр., Беласток, хоць і то яшчэ пытаньне). Менск і Беларусь хрысьціянскіх дэмократаў зусім ня цікавіць. Аб плебісцыту ня можа быць і гутаркі. Аб фэдэрацыі—гэтак сама. Справу Вільні (у Віленскім павеце подлуг літоўскай статыстыкі ёсьць 30% палякоў) разьвяжа або Антанта, або вайна.

Гэта—групы соймавые. За імі стаяць дзьве групы інтэлігэнцкіе, ня маючые сваіх прадстаўнікоў у Сойме: Пажанга (Поступ) і Сантара (Злучнасьць). Абедзьве яны ў справе польска-літоўскіх адносін займаюць становішчо ад нольквае з групаю Сьляжэвіча.

— Ці пан пасол не гаварыў з прадстаўнікамі ураду?

— А як-жа, разам з п. проф. Камянецкім конфэравалі мы з радам уплывовых сяброў б. ураду, з яго старшынёю Галванаўскім, з цяперашнім маршалкам Сойму Стульгінскім і з іншымі. Найбольш характэрным было аднак слова міністра заграничных спраў п. Вальдэмараса. Вось што ён нам сказаў:

„Польшча вядзе політыку авантурніцкую. Быць можа яна даволі дужая. Але Літва гэтага рабіць ня можа. Польшча штучна будуе незалежную Беларусь і Украіну. Літоўцы лічаць, што Беларусь і Украіна—гэта ўнутраные расійскіе справы. Літоўцы не дапусьцяцца, каб іх уцягнулі ў акцыю, каторая-б на доўгіе годы пасварыла іх з Расіяй і Нямеччынай. Літоўцы апіраюцца на Англію“.

Пан Вальдэмарас мае надзею, што прычыны, каторые схіляюць Англію падтрымліваць Літву, пастаянные, а не выпадковые, пераходные. Што датычыць плебісцыту, то гэтая ідэя збанкрутавала ў часе вайны. Плебісцыт у Вільні для літоўцаў быў-бы тым самым, што плебісцыт у Парыжы для француза. Літва ня бачыць патрэбы падтрымліваць пясьнейшых адносін з Польшчай, чым з іншымі дзяржавамі. Літоўцы скарэй зракліся б Вільні, чым згадзіліся-б на фэдэрацыю з Польшчай.

Перадрукаваўшы гэтую інформацыю з „Нашага Краю“, віленская літоўская газэта ў польскай мове „Эхо Літвы“ зьмясьціла перадавы артыкул, у каторым паміж іншым піша:

„Гутаркі палякоў з літоўцамі—рэч добрая, няма чаго казаць. Чым часьцей і шчырэй будуць яны адбывацца, тым лепей і скарэй паразумеемся: Абы толькі гэтые гутаркі (выведы) публікаваліся ў форме сьціслай, праўдзіва перадаючы думкі і словы субяседніка. У гэтым сэнсе, нажаль, часта паўстае сумненьне“.

Далей газэта прыводзіць прыклады, як „Robotnik“ раз непраўдзіва перадаў словы літоўскіх інформатараў, проці чаго яна прымушана была выступіць з вострай крытыкай, сушнасьць каторай прызналі потым і самі інформатары. „Ковенскіе выведы“, — піша „Эхо Літвы“:— паўторакы са слоў прадстаўніка адной стараны п. Недзялкоўскага, але не падцьверджаны подпісам ня толькі другой стараны, а навет абавязковай літарай N. Гэтак мы ня маем пэўнасьці, што ня ўкраліся туды некаторые адценкі суб'ектывізму таго, хто рабіў выведы...

У ковенскіх выведзінах, напрыклад, пасол Недзялкоўскі, а можа толькі „Наш Край“, пастаянна цьвердзіць, што ўсе літоўскіе паасобные партыі выключаюць Беларусь з політычных комбінацый. Як мы павінны былі б гэта разумець? Са слоў мін. Вальдэмараса ў перадачы „Нашага Краю“ відаць, што „літоўцы лічаць справу Беларусі і Украіны ўнутраной справай Расіі,—дык значыць і іншые партыі, напр., соц.-дэмакратыя і соцыялісты народнікі, гэтак сама яе разглядаюць? Тым часам мы ведаем аднак добра, што літоўскае грамадзянство пастаянна падтрымлівае беларусаў у іх стараньнях утварыць сваю дзяржаву, выходзячы з прынцыпу права кожнага народу на самаазначэньне. Іншая справа, калі хочуць ад літоўцаў, каб Беларусь з Літвою была дзяржаўнаю адзінкай,—конгламэратам, зьлепленым абшарніцкай і буржуазыйнай глінай польскай ахвярбоўкі, на што літоўская дэмакратыя згадзіцца ня можа. Дзеля гэтага, калі мін. Вальдэмарас казаў, што беларускую справу літоўцы разглядаюць, як унутраную расійскую справу, то заяўленьне гэтае мы прымушаны рашуча адкінуць, як вельмі загульненае. Нарэшце, словы мін. Вальдэмараса ў перадачы „Нашага Краю“, пастаўленые побач з заявамі прадстаўнікоў соц.-дэмакратыі ў справе фэдэрацыі, яшчэ раз падцьвярджаюць, што ўжываньне агульнай формы „літоўцы“ церасчур пасьпешные: „літоўцы зракліся-б скарэй Вільні, чым мелі згаджацца на фэдэрацыю з Польшчай“ (проф. Вальдэмарас) і—„фэдэрацыі з Польшчай партыя (с.-д.) не адкідае“! Просім гэта пагадзіць! І хто тут правінаваціўся—проф. Вальдэмарас, паслы Венслаўскі і Кайрыс, пасол Недзялкоўскі, ці „Наш Край“?..

„Адгэтуль мы бачым“,—канчае газэта „Эхо Літвы“,—„з якою асьцярожнасьцю трэба прымаць агульную інформацыю, асабліва апошнюю ковенскую“.

Я. Л—к.

Харaство нашага краю.

Нашы маладые наіўные поэты знаёмые з сваім родным краем з дрэнных расійскіх падручнікаў, вельмі часта ў вершах гавораць пра беднасьць, пра „гразь, балото і пясок“ на Беларусі. Харaства роднага краю яны ня бачаць і не апісуюць. А ты часам, наш край, адзін з прыгажэйшых краёў у сьвеце. Хто, напрыклад, ня ведае клясічнага апісаньня харaства нашага краю А. Міцкевіча ў яго бясьсмертнай поэме „Пан Тадэуш“?

„Родная зямелька! Ты, маўляў здароўе,—
Той цябе ацэнцуе, каму безгалоўе,
Хто жыў калісь на ніўцы тваёй, як у раю,
І вось крывавы сьлёзкі роніць у чужым краю.
Цяпер то, як ты красна, я чую, я бачу,—
І апішу, бо усьпяж па табе плачу.
. . . .
Пакуль-жа блісьне шчасьце, хоць душу нягодну
Зьвярні да гор лясістых, шырокіх пракосаў,
Што дыванамі пры Нёмне сьвецяць з пад нябёсаў;
Да ніў родных, калосьсем ярка маляваных,
Залочаных пшаніцай, жытам пасрабраных,
Гдзе жоўтая сьвірэпка, гдзе грэчка бяленька.
Гдзе дзяцеліна гарыць, вось красна паненка,
А ўсё мяжой прыбіта, бачыцца устужкай,
Там, сям, быццам к адзежцы прышпілена грушкай.
. . . .
Між такімі палямі—намесь—пры ручаю,
На узгорку невялікім, у бярозавым гаі,
Сьвяціў шляхецкі хорам, кругом дзеравяны
Да на падмураваньні,—увесь пабялены;
Тым бялейшы, што тополь сьпераду і збоку
Сьцерагла ад сіверу восень глыбоку.
Дом жылы невялікі, чыста напрыглядку.
Зато гумно—важна! Пры ім стажкі ўжатку,
На стоўпілісь ў гарудах,—пабачыш з намеку.
Відно што ніўка—маці тутка чалавеку!
Відно з густых коп сена, што на сенажаццы
Зьвездачкамі мігаюць; з сох, што там бадзяцца
Па шырокіх палетках, проста чарназёму,
Каторы прылягаець к беленькаму дому;
Узораных парадкам агародных градак,—
Што там цьвіцець дастатак, праўда і парадак.
Брама насьцеж у будні дзянёк, ці у сьвята,
Кажаць, што госьцям рада гаспадарна хата“.

Такі мае вобраз наша старонка ў вачох вялікага поэты.

А цяпер паслухаем, што кажуць расійцы пра харaство і багацьце нашага краю. Перад намі расійская кніга „Россія. Географическій сборникъ“. С. Меча. На страніцы 105 ёсьць нарыс аўтора гэтай кнігі,— „На берегах Свислочи“. Там мы чытаем:

Ліпень, жнівень і верасень я пражыў на Меншчыне, на беразе Сьвіслачы...

Мой пісьмены стол стаяў каля акна, каторае выходзіло ў сад; за плотам сюда было поле, а за полем хваёвы лес. Часта, калі я пісаў што небудзь, я мімавольна заглядаўся на гэты лес і забываўся пра сваю работу.

Навакола далёка далёка расьцілаецца раўніна, ціхая, вабкая, укрытая нівамі, лясамі і беларускімі вёскамі...

...Меншчына ляжыць трошкі больш на поўдзень ад Масквы, а тым часам—паглядзеце, які пышные дубы растуць у Меншчыне, асабліва на лагчынах, што заліваюцца ў разводзьдзе вадою,—якіе ліпы, якіе велізарные бярэзіны! Граб зусім звычайнае дзерава ў лясох, гдзе мясцовасьць больш вільготная, а хто бачыў яго пад Масквою? Вясна пачынаецца рана і ўся зьвініць ад гоману і сьпеву птушак самых разнастайных парод; зіма нехалодная, часам зусім бяз сьнегу; лето гарачае, але яно асьвяжаецца такімі навальніцамі з пярунамі, якіх я ня бачыў у Расіі...

А якая тут восень, які верасень я правёў у Меншчыне! Верасень—мой любімы месяц, але ў нас (у Расіі) звычайна псуюць яго дажджы, што льюцца цэ-

лые тыдні, вецер і холад. А тут—у канцы верасьня я працаваў каля адчыненага вакна; небо было ўсё сіняе, бяз ніводнае плямачкі; цёплы паўднёвы ветрык чуць шастаў лісьцём яблынь, а доўгая белая павуціна, каторая невядома адкуль узялася, ціхенька плыла ў паветры. А потым настаў ціхі, залаты вечар,-такі вечар, што каб я мог, я спыніў бы яго ды зрабіў яго бясконцым, і ўсё маё жыцьцё любаваўся б гэтымі ляснымі дарожкамі, бягучымі некуды ў цень паміж соснаў гэтымі махрастымі залаціста-жоўтымі бярэзінамі, што аж гараць на фоне саснавага бору і стаяць непарушна, нібы заварожаные спакойнаю урачыстасьцю заходу сонца. Як толькі находзіў вечар, я выходзіў на адну з сваіх любімых дарожак ды ішоў па ёй ціха, ціха. Ніколі ніякая музыка на сьвеце, ніякая кніга, ніякі малюнак, ніякі спэктакль не давалі мне гэтулька асалоды і прыемнасьці, як постаць гэтых дрэў, аблітых прашчальным блескам заходзячага восеньняга сонца. Праўда, да восеньняга акорду пачуваньняў пастаянна далучаліся сумныеноткі, але гэты сум такі ціхі, такі нячутна далікатны, што скарэй прыемны, як балючы.

Такі край, як паўночная палавіна Меншчыны, мог бы пры дапамозе чалавека абярнуцца ў адзін з найпрыгажэйшых краёў, Яго лясы і цяпер, калі іх не чапалі, маюць выгляд прыгажэйшых паркаў,—такіе яны чыстые і харошые: роўные сосны стаяць нібы колёны гіспанскага храма. Яго нівы ўраджайные, дзякуючы вельмі добраму клімату і пры рацыянальнай гаспадарцы маглі-б карміць вялікае насяленьне. Яго балоты, калі покі што не даюць карысьці, нікому не замінаюць, а з часам дадуць багацейшы запас тарфяного апалу, ня кажучы ўжо аб тым, што торф, прымешаны да пясчанай глебы, утварае найлепшае паляпшэньне зямлі. Паглядзеце хоць на гэтае: скрозь каля поля, засеенага грэчкаю, на краёх лесу, каля лугоў, што заліваюцца ў разводзьдзе, стаяць вялікіе цяжкіе калоды. Гэта—старасьвецкай будовы вульі для пчол. Часам яны стаяць на зямлі, часам умацованы на дзераве; іншы стары дуб бывае абвешан гэтымі калодамі... Аб гэтых вульях, аб гэтых пчолах ніхто не клапоціцца... Літва і Беларусь спрадвеку славяцца багацьцем пахучага мёду. I гэтак шмат чаго іншага. Меншчына магла-б быць вельмі багатая і вельмі прыгожая.

Але дзеля таго трэба, каб там жылі людзі з разьвітым розумам, ведаючые і ўмеючые цаніць харасво. А гэтага і няма..."

Гэтак канчае сваё апісаньне Меншчыны расійскі географ, С. Меч. Але—ці-ж гэта праўда, што ў нас няма людзей, ведаючых і ўмеючых цаніць харасво і багацьце роднага краю?...

Я. К.

АПОШНІЕ НАВІНЫ.

Ангельцы памагаюць Пэрсыі.

НАЎЭН, 19—VI. З Лёндану паведамляюць, што Англія высылае Пэрсыі дапамогу, каб загарадзіць бальшавіком дарогу на Тэгэран.

Паўстаньне ў Албаніі.

ПАРЫЖ, 19—VI. З Валёну паведамляюць, што становішчо італьянцаў паляпшаецца, дзякуючы прыбыўшай дапамозе.

Прадстаўнік Врангэля ў Польшчы.

ВАРШАВА. 19—VI. Адтрымана вестка, што ў Варшаву прыедае прадстаўнік Врангэля, гэн. Глазенак.

Міністэрскі крызыс у Нямеччыне.

БЭРЛІН, 19—VI. Прэзыдэнт рэспублікі даручыў стварэньне габінэту старшыні нацыян. Сабраньня Фэйербаху.

Антыбальшавіцкі рух ў Эстоніі

ВАРШАВА. 19—VI. У Эстоніі пачаўся вялікі антыбальшавіцкі рух. У газэтах выказваюцца за саюз Эстоніі з суседнімі дзяржавамі проціў бальшавікоў.

Забастоўка ў Варшаве.

ВАРШАВА, 19—VI. Забастоўка ў Варшаве трывае далей. Да згоды яшчэ ня прышлі.

Байкот Вэнгрыі.

ВЕНА, 19—VI. „Der Abend" паведамляе, што аўстрыяцкі саюз чыгунак абвясьціў байкот Вэнгрыі за белы тэрор. З 20 га чэрвеня ня будуць прымацца на аўстрыяцкай чыгунцы ніякіе грузы для Вэнгрыі. Да гэтага байкоту далучыўся саюз пачтова-тэлеграфных служачых, каторые не будуць прымаць і перадаваць лістоў і тэлеграм [illegible] грыі, за выключэньнем [illegible]расп. прадстаўнікоў Антанты.

Міністэрскі крызыс у Польшчы.

Посьле адмаўленьня П. П. С. прыняць учасьце ў утварэньні габінэту, Скульскі паслаў да Начальніка Дзяржавы ліст з адмаўленьнем ад утварэньня габінэту.

Посьле адмаўленьня п. Скульскага адбылося прыватнае пасяджэньне прэзыдыумаў партыяў: народнага злучэньня, сялянскага саюзу і народнай рабочай партыі, на каторым разглядалося пытаньне аб утвораным палажэньні.

На пасяджэньні выясьнілася, што адзіным выхадам з утворанага палажэньня ёсьць даручэньне утварэньня габінэту Народнай Рабочай Партыі.

Аб гэтай пастанове быў паведамлен Начальнік Дзяржавы.

Начальнік Дзяржавы, ў зьвязку з пастановай конфэрэнцыі, запрасіў да сябе лідэра фракцыі Народнай Рабочай Партыі Брэйскага і прапанаваў яму пачаць утварэньне габінэту.

Брэйскі прапанаваньне прыняў. Міністэрскі крызыс такім чынам падыходзіць к канцу і гэтымі днямі новы габінэт будзе ўжо утворан.

Перагаворы з бальшавікамі.

Перагаворы з Красіным.

Венскае Бюро Карэсп. паведамляе з Лёндану, што перагаворы з Красіным сустракаюць усё большые перашкоды, бо Красін ня можа даць ніякіх гарантыяў. Перагаворы маюць быць перарваны.

Адказ Чэрчыля на ліст Леніна.

Ангельскі міністар вайны Чэрчыль выдрукаваў у „Evening News" артыкул, у каторым адказвае на ліст Леніна да ангельскіх рабочых. Ён констатуе, што бальшавіцкіе дыктатары, ўрэшце адчынілі вочы на тое, што цяпер дзеецца ў Расіі, навет тым людзям, каторые да гэтага часу нічога ў гэтай справе ня ведалі. Ленін зьнішчыў расійскую рэспубліку, скасаваў расійскі парлямэнт і пазбавіў край ад дабрабыту, міру і волі. А што ён даў узамен? Давёў Расію да голаду, абязьлюдзіў гарады, зруйнаваў промысел і зямельную гаспадарку.

„Les Debats" паведамляе, паміж іншым, што ліст Леніна выклікаў у ангельскіх работніцкіх сфэрах кепскае ўражаньне.

Фінляндыя дамагаецца доступу да Белага мора.

На расійска-фінляндзкай конфэрэнцыі старшыня фінляндзкай дэлегацыі заявіў, што адным з галоўных жаданьняў Фінляндыі ёсьць справа доступу да Белага мора.

Політычные весткі.

Узбройная інтэрвэнцыя проціў бальшавікоў.

Гэтымі днямі ў Лёндане адбылося пасяджэньне Рады Лігі народаў. Застанавіліся над справай узбройнай інтэрвэнцыі з прычын нападу бальшавікоў на Пэрсыю, дзе бальшавікі занялі невялікую мясцовасьць.

Немцы і бальшавікі.

„Deufsche Allgemiene Ztg". адказвае на артыкул „Tempsa", каторы пацьвердзіў, што бітва паміж Расіяй і Польшчай адбываецца пад кіраўніцтвам пруского гэнэральнага штабу, які стараецца перашкодзіць справам Польшчы і Францыі. Памянёная нямецкая газэта апраўвергае гэтые весткі.

Францыя і Англія дамагаюцца далейшай дэмобілізацыі.

У адказе на інтэрпэляцыю аднаго з паслоў Лёйд Джорж сказаў, што міжнародная кантрольная камісія ацаніла нямецкіе ўзбройные сілы 10 га мая на 270, 000 чалавек. Нямецкая вайсковая ўлада на месяц пазьней паведаміла, што ўзбройные сілы зьменшаны да 200, 000 чалавек, а ў нэўтральных сфэрах ёсьць 10 батальёнаў, 5 эскадронаў і 1 батарэя. Кантрольная камісія не закончыла сваей працы, але ўжо відаць вялікая рэдукцыя нямецкай арміі дасягнутая ў прадцягу апошніх месяцаў. Нямецкі урад выдаў распараджэньне аб дэмобілізацыі і разброеньні войск. Але поруч з гэтым немцы падалі просьбу аб дазволе мець свой узбройны флёт.

Зьмяншэньне цэн.

У Вене значна зьменшыліся цэны. Вялікіе венскіе фірмы наладзілі продажу ўсялякае крамы. Пара панчох каштуе 45 кр., жаноцкіе капелюшы—100 кр., крамніну, за якую яшчэ нядаўна плацілі 1000 кр. за аршын, сёгоньня можна дастаць за 400 кр. Насяленьне ня вельмі сьпяшаецца з закупкамі, спадзяючыся яшчэ большага зьмяншэньня цэн.

У Амэрыцы, паводлуг ангельскіх газэт, цэны зьменшыліся на 15%, а некаторых мясцох на 30—40%.

Чэхі проціў пасрэдніцтва.

У чэха-славацкім парляменце паўстала вострая опазыцыя проціў пасрэдніцтва Антанты ў польска-чэскай справе аб Цешынскай Сылезыі. Істнуе чутка, што чэскі урад сам мае урэгуляваць гэту справу.

Сказ аб гусьлях.

Ахвярую чарадзею беларускай лірыкі—Янку Купале.

Заходзячае сонцо, прабіваючыся праз грозные, яркіх, вагністых колераў хмары, крывавіць і без таго ўжо абкрываўлены ўзгорак. А ўзгорак гэты ад таго, што зямелька згорбілася, згорбілася ад вялізарнага цяжару, каторы трымае на сабе. Вось ляжаць покатам велікалюдні, згінуўшые ў надмерных змаганьнях за жыцьцё. Тутка—там тырчаць паглумленые стрэлы, лукі, сякеры, а то і сукаватые доўбні, а адзін з малой цаў загубленых ляжыць з каранастым, вырваным дрэўцам, як дзіцянё, заснуўшае з цацкай—уцехай. Над пабоішчам кружацца, каркаюць груганы. Відаць блеск пажару. Прыйшоў ліхі вораг, як навальніца, як кара, паглуміў, пабраў, стаптаў усё лепшае, здаровае, пазганяў у нетра, балоты ўсё жывое. Толькі вось на пабоішчы, пужаючы груганоў, хістаецца кволы чалавек, пакінуты доляй паміж мерцьвякоў, руін, і папялішчаў, як непатрэбшчына. Ён, знаць, гусьляр, бо тупае каля паломаных гусьляў і, як тая баба на хаўтурах, галосіць—прыгаварывае:

— Туга розум мой паланіла, калючкамі сьцежку ўкрыла, чорным крылом засланіла радасьць сьветлых дзён. Па сьцежках, між красак і дубоў цявістых, тут песьня хадзіла, ў блеск словца прыбрана, край адгукаўся рэхам галасістым, а рэхо чуў Ільмень, Царград мураваны I вечо ў Полацку песьняй гардзілася, і гэтай жа песьняй старонка малілася. О, гусьлі мае... о, песьня няспетая!..

Але тут сьпяцьлівае марматаньне гусьляра перабіла гэткая гутарка з боку:

— Вось ідзеш, як па падушца! А ты, Ільля, як там?

— Стой, Пётра! Ратуй, братка! Ну і ўгрэз жа я!

— А я так сама сунуся на дно дрыгвукі і бачу праз альшэўнік, лазу і чаромху, што людзі там на ўзгорку сьпяць, хоць яшчэ і для курэй спаць рана.

— Гоп! гоп! А хто там жывы,—хадзі і паратуй, бо балото жыўцом нас глыне!

Пачуўшы гэта, гусьляр куцнуў у кусты, скульшоў клiч, кажучы:

— Добра, добра, бягу ўжо, а са мной дапамога і ўсё такое...

Паохаўшы, пастагнаўшы, выкаціліся ўрэшце на ўзгорак Пётра, Ільля і Гусьляр.

П ё т р а. Ух, выкаціліся, хоць, мабыць, камар дужэй будзе за вашага паратуншчыка. Ну, але памаленьку, неяк-жа...

І л ь л я. Але-ж і гразка ў вас! І чаго вы тут ка разгнязьдзіліся.

Г у с ь л я р. А таго, што захаваліся ад ворагаў, гвалтаўнікоў, крыўдзіцелеў нашых. Не даюць нам распачаць жыцьцё... Але і тут ня дрэнна: зямелька-маці усіх прыгартае і рада, чым багата... Вось толькі гусьлі... Ой, бедные, бедные мае гусьлі! Ну, але час вам мусіць узяцца за справу, па якую прыйшлі, і хутчэй толькі. Эх, бо мне ўсё роўна цяпер—няміла жыцьцё паміж груд пабітых людцаў ні за што, ні праз што, гібеюць не пахаўгураные, пакінутые на папас зьвяром, груганом, рабаком...

П ё т р а. Што ён кажа?!

І л ь л я. Дык гэта значыць усе мерцьвякі? Дзень мой—век мой, гадзіна—прыбаўка...

П ё т р а. Дык скажы, чалавеча, што тут такое здарылася?

Г у с ь л я р. Тут, як гэта і ўсюды вядзецца, людзі захацелі мець болей свайго, а гэтае сваё расьце лепш, калі яго крывёй паліваць... Мы—во ў якую нетру запраторыліся, аднак чорны бог усюды жывець, а з людзьмі яму вельмі дасужа. Не здарма і вы сюды прышлі. Дагадываюся я крыху...

П ё т р а. А скуль табе ведаць, чаго мы прышлі?

Г у с ь л я р. Ой, каму больш ведаць, як ня мне? Я—гэта усё, што вы бачыце, увесь край, а ўвесь край—гэта я. Яго радасьць—мая радасьць, яго горо—маё горо. Дык як жа мне ня ведаць? І вось сваю веду вам перакажу, што сюды які толькі дурань-прыблуда, чужак-пустадомак не ўспаўзе, кожны хоча гаспадарыць, каб яму ўсяго, чаго ён ні жадае. І вось пасьля яго гаспадаркі, пасеўнае поле лесам зарастае, вёскі пажарышчам пужаюць, гарадзішчы зруйнаваны, а людзі дзічэюць па лясох, балотах... Ну, дык чаго-ж стаіцё? Бярэце мяне ў палон, а не, дык забеце, ці абдзірайце вун тых мерцьвякоў—мне ўсё роўна... Вось толькі гусьлі... Ой, гусьлі мае даражэнькіе! Іграньце сваё срэбнае слово, узнясеце к зорам душу маю, каб ня бачыць чуць людзей, грэху іх; паратуйце душу маю асірацелую, абяздоленую.

П ё т р а. Ат, уздумаў-жа прыгоду! Ад розуму мабыць адбіўся.

І л ь л я. Дзіўны ты чалавеча! Мы зусім не памыкаемся на тваё жыцьцё-быцьцё. Мы ня тутэйшые. Мы вучні Хрыста, вучыцеля ўсіх мудрацоў, прышлі з мірам і дабром.

Г у с ь л я р. Ня ведаю я вашага Хрыста і пакорна дзякую за фатыгу: зубы нечага загаварываць, бо яны мне і не баляць... Добрые і вы цацы.

І л ь л я і П ё т р а:

— Як вы Хрыста ня ведаеце?

— Куды-ж гэта мы заблудаліся, калі так?

Г у с ь л я р. Як, дык вы ніведаеце, што гэта крывічанская зямля?! Дзіва! Мы, крывічане, апрыч таго, што з дрыговічамі і радзімічамі маем адну праўду, але з намі жывець яшчэ вялікі таёмны дух, у паслузе якога знаходзяцца сонцо, грымоты, русалкі, дамавые, лясуны, вадзянікі і моц іншых усьведаў, усемагутных.

П ё т р а. Гм! Вялікая дружына ў твайго Бога, але толку з яе, як відаць, мала.

І л ь л я. Э, гэта ўсё робіцца ўжо дакучлівым. Абач, добры крывічанін, будзь яшчэ лепшы і прынясі нам сьлязу неба, а то мы разсохнемся ад тваей гасьціннасьці.

Г у с ь л я р. Выбачайце, але ж вы не на вясельле прышлі. Во—гляньце навакола, на ўвесь відавок, колькі тут было крыві разьліваньня, сілы пагубленьня, а сьмерці пажыўленьня. Хамы ўсе яны грубые, азьвярэўшые. Нашто браць, нашто гвалціць... хто пільнуе, той крадзе... Вялікі, таёмны дух не лаваў, не адымае—ён толькі стараецца разгадаць свайго Бога. Дык і мы жылі-б і пазнавалі яго, і моцай духоўнай дужэлі-б. Эх, граў я паміж іх адзічэўшых, разогненых злосьцяй, граў на гусьлях і песьняй хацеў палонiць іх тупые душы. Я падстаўляў свае грудзі пад сякеры, пад капыты, але яны не мяне зарубілі, стапталі, забілі, а маю песьню, ганебна пакрыўдзілі мае гусьлі чуластрунные. Я быў паміж імі, і як сырод буралому ў роспачы крычаў: не крываўце зямлі, не крываўце зямлі, не крываўце зямлі!.. О гусьлі, о гусьлі мае, іграньце срэбнае слово, усьцешце мяне—непатрэбшчыну, самае кволае, няздатнае стварэньне, лішніцу, пустацьвет...

П ё т р а. Крывічанін, не валтузься! Хай боль твой сунімецца, бо ты дужэй за ворагаў, мурдэй паміж сваіх, ты за сьмерць крапчэй.

Соцыялістычны рух заграніцай.

Конфэрэнцыя III інтэрнацыяналю адбылася нядаўна ў Мэдзіёлане пры ўчасьці прадстаўнікоў Расіі, Баўгарыі, Вэнгрыі, Францыі, Італіі і Швэйцарыі. Пастаноўлена склікаць у бліжэйшым часе поўную конфэрэнцыю ўсіх партыяў, якіе стаяць на грунце III інтэрнацыяналю, і выбраць цэнтральнае бюро з прадстаўнікоў усіх Эўропэйскіх партыяў. Пастаноўлена, каб у ўпраўленьні вялікіх партыяў, якіе належаць да III інтэрн., былі сталые прадстаўнікі брацкіх арганізацыяў іншых краёў, каб такім спосабам пашыраць інтэрнацыянальную працу. Аднагалосна прынята рэзалюцыя, заклікаючая ўсе партыі да энэргічнейшага, чым да гэтага часу, падкрэсьленьня розьніцы між другім і трэцьцім інтэрнацыяналам. Трэба зусім парваць з опортунізмам і рэформізмам. Конфэрэнцыя зацьвердзіла дзеі і тактыку III інтэрнацыяналю. Заклікае да агітацыі на карысьць міру з Расіяй. „Аднаўленьне гандлю зьвязано для Расіі з вялікай небясьпекай, пакуль загадкіе саюзы і коопэратывы арганізаваных рабочых ня прыдуць на дапамогу расійскаму пролетарыяту“. Нарэшце, Конфэрэнцыя паслала брацкае павіншаваньне пролетарыяту Расіі, Нямеччыны і Вэнгрыі.

У Літве.

Компэнсацыйны трактат паміж Літвою з немцамі.

Паміж Літвою і Нямеччынай утварыўся компэнсацыйны трактат на працяг аднаго году. Немцы маюць даставіць Літве 5,000 тон вугалёў узамен за зямельные і драўляные прадукты.

Рэформа валюты ў Літве.

Да гэтага часу манэтаю ў Літве быў г. зв. „Ostrubel“, заведзены яшчэ немцамі, роўны 2 нямецкім маркам. У хаду ў Літве ёсьць якія 800 мільёнаў остроблёў, 200 мільёнаў нямецкіх марак і 400 мільёнаў расійскіх рублёў. Цяпер літоўскі урад задумаў завесьці ўласную грашавую систэму. Адзінкаю будзе „скатікас“. 100 „скатікас“ складаюць „муштіvіс“, каторы раўняецца францускаму франку, забясьпечаны ён будзе спэцыяльнаю заграбічнаю пазычкаю і пакрыты ў 40 процантаў золатам.

Забастоўка ў Коўне.

15-га чэрвеня пачалася забастоўка на некаторых фабрыках, электрычнай ст. і на чыгунцы. Забастоўка наборшчыкаў ужо цягнецца трэцьці тыдзень. Прычына забастоўкі чыста эконаміцкая.

У Латвіі.

Новы латвійскі габінэт.

Па даручэньню старшыні констытуанты Ульманіса ўтворан новы габінэт вось у якім складзе: 1) старшынёю міністраў—Ульманіс, 2) міністар заграничных спраў—Мейровіч, 3) унутраных спраў—Бэргс, 4) скарбу—Цурынскі, 5) справядлівасьці—Бэнуш, 6) вайны—Фэльдманіс, 7) прамысловасьці і гандлю—Сомэрс, 8) комунікацыі—Куршынскі, 9) харчоў—Кальніх, 10) земляробства—Цэльніх, 11) асьветы—Флекіс, 12) грамадзянскай працы—Асольнсог, 13) дзяржаўны кантралёр—Мятс, 14) віцэ-міністар унутраных спраў з правам голасу—Кіндзуле. У габінэце прадстаўлены ўсе латвійскіе партыі за выключэньнем соцыяль-дэмакратаў. З габінэту, які вышаў у адстаўку, ў новы габінэт увайшло 6 міністраў.

Схамянецеся!

Да вас, хто забыўся пра сваю Бацькаўшчыну, зрокся свайго роднага звярочаюўся я з гарачым, шчырым словам: схамянецеся! Кіньце тыя байкі, якімі абдурвалі нас ворагі нашага адраджэньня: гэта гадкае ашуканство!

Яны апрача таго, што нішчылі багацьце нашага краю, кіраваліся яшчэ і да таго, каб праглынуць 12-і мільёны Беларускі народ. Дзеля гэтага яны карысталіся з ўсялякіх способаў, не ганьбілі нічым... Нас сумысьля трымалі ў цемры, каб ніхто не даведаўся аб нашых крыўдах. А калі і давалі крыху асьветы, як даюць жабраку кавалак чэрствога хлеба, то з атрутай. У школах калечылі душы нашых дзетак, закідалі ім у сэрцы ненавісьць і агіду да свайго роднага. І большая частка сялянскіх дзетак варочалася дамоў ужо чужынцамі, здраднікамі... У нас адабралі друкаваную ў роднай мове кніжку, забаранілі ўжываць ва ўсялякіх выпадках роднае слово. На кожным кроку тлумачылі, што беларусаў няма і ня было; рабілі кпіны, зьдзек, закідвалі брудам найдаражэйшы скарб народу—яго мову, песьню, звычаі. І мы, беларусы, зацікліся, замкнуліся ў сваім адзіноцтве. Наш сум, нашы жальбы чуў толькі густы бор ды ніўка, калі палівалі яе потам, здабываючы сабе кавалак чорнага хлеба...

Ворагам нашага адраджэньня заставалася толькі карыстаць з свае працы, якая была добра нарыхтавана. Сьвядомасьць народу зьнішчана—толькі ўцяшаліся. Але жыцьцё выявіло што іншае. Шчырые сыны народу, якіе не прадалі сумленьня за шклянку салодкае гарбаты, за гвязды і гузікі, узяліся за працу дзеля адраджэньня Бацькаўшчыны. Магутны покліч пачуўся ад мяжы да мяжы ў родным краю, рэхам адбіўся ў глухіх вёсачках пад саламянымі стрэхамі. Пачалі зьбірацца вакі, лік іх з кожным днём множыцца. Яны сьмела ідуць па шляху, які вядзе да лепшае будучыны, да шчасьнага незалежнага жыцьця. І ніхто ня затрымае гэтага поступу!..

І вось у гэты час, калі жыцьцё, як шалёнае бяжыць уперад, калі сьвяты абавязак кожнага сумленнага чалавека — праца дзеля таго, хто ўзгадаваў цябе, ускарміў сваім хлебам—ёсьць людзі, што зьнявяжаюць роднае,—сэрцо крышыцца ад болю. Усе народы лічаць за гонар мець сваю мову, а 12-і мільённы Беларускі народ саромеецца яе. За што народ Беларускі зьневажае гэтак сваю Бацькаўшчыну—Матку Беларусь? Няўжо ж яна нам ня матка, а мачыха, а мы ёй ня дзеткі?..

З братэрскімі нам народамі мы вышлі на шлях лепшай будучыны. Будуць зьяўляцца вялікіе і малые народы, будуць класьці на агульны аўтар вялікіе і малые ахвяры, здабытые ад свае крывавае працы, каб потым, як з крыніцы, разам піць асалоду. А ты, беларус, што ахвяруеш? З пазычанай мовай прыдубаеш?..

Моладзь беларуская! Ты кветка свайго народу, яго надзея! Скінь панскіе акуляры, праз якіе гэткі даўгі час глядзела. Зірні ў вёску: там гібеюць твае бацькі, браты, якіх ты зраклася. Глянь сабе ў сэрцо глыбей: там надшукаеш родныя словы, бо ты іх першым вымавіла, родную песьню, сьвятыню пакуты цэлага народу; гонар знойдзеш свой, спазнаеш крыўды. Напішы на сваім сьцягу: „Жыў беларус і жыве“! ды за працу! Матка Беларусь яшчэ прабачыць твае абмылкі і прыгорне, як каханага сына!..

Алесь Старычанін.

Прыказ.

Галоўнага Правадыра польскіх войскаў да п. Камісара Усходніх Зямель у справе прыгатаваньня проэктаў уставаў, рэгулюючых уладаньне зямлёю згодна з зямельнай рэформай, прынятай Установчым Соймам Рэчыпаспалітай Польскай 10 ліпня 1919 г.

Прызнаючы пільнай патрэбай упарадкаваньне зямельных спраў на Ўсходніх Землях на грунце права і справядлівасьці, ацэньваючы значэньне дужага і заможнага грамадзянства для дабрабыту краю, а так сама прымаючы пад увагу інтарэсы людзей безьзямельных і малазямельных, вызваленых ад векавога уціску і крывавага бальшавіцкага тэрору польскім жаўнерам, каторы прынёс людзям з вызваленьнем політычным і адраджэньне эканаміцкае, пастанаўляю правесьці на гэтых абшарах затрыманую да гэтага часу урадам захватчыкаў зямельную рэформу.

З гэтай мэтай прыказваю Цывільнаму Упраўленьню Ўсходніх Зямель прыступіць да апрацоўкі належных проэктаў уставаў, згодна з проэктам зямельнай рэформы, прынятай Соймам Рэчыпаспалітай Польскай 10 ліпня 1919 г., запэўніўшы безьзямельным і малазямельным магчымасьць здабыцьця нацыянальных варстатаў для працы, а так сама урэгуляваньне уладаньня зямлёю такім способам, што дзяржава будзе распараджацца для колёнізацыі і парцэляцыі патрэбнай колькасьцью зямлі, здабытай з дзяржаўнай маемасьці і абшараў, выкупляемых у меры паступленьня парцэляцыі ад прыватных уласьнікаў, згодна з устаўным прымусам.

Варшава, Бэльвэдэр. 26 мая 1920 г.
Галоўны Правадыр **Я. Пілсудзкі.**

Беларуская кроніка.

Выпускны акт Менскіх беларускіх школ.

У пятніцу 18 чэрвеня ў залі Школьнай Рады (Беларускі дом) адбыўся урачысты выпускны акт вучняў 1, 6 і 7 Беларускіх Вышэйшых Пачатковых школ м. Менску. Каля 12 гадзіны сабраліся вучні і настаўнікі гэтых школаў. Заля была убрана вецьцем расьлін. На акт прышло шмат гасьцей і прадстаўнікоў розных арганізацый.

Перад пачаткам быў прапеты хорам п. Тэраўскага беларускі гімн: „Божа, што калісь народы“. Урачысты акт адчыніў Старшыня Б. Ш. Р. М—Рак-Міхайлоўскі такою прамоваю: „Вучні, вы цяпер становіцеся сталымі грамадзянамі, і на вас ляжыць вялікі абавязак. Вы адтрымалі патрэбную сабе адукацыю. Але кепскіе былі варункі, пры якіх вам прыходзілася вучыцца. Улады меняліся і ў школах нельга было паставіць беларусазнаўства, як павінна быць. Цяпер прад вамі стаіць школа жыцьця—школа больш трудная і адначасна шырэйшая. Трэба толькі працаваць духам беларуса, спазнаць сябе і дапамагчы ў будове нашай дзяржаўнасьці“. Далей прамоўца зазначыў, што Беларуская Школьная Рада з ахвотай

Ільля. І чутка аб табе разойдзецца, а на небе будзе самая слаўная.

Гусьляр. Ці вы згодны з гэтым, сьветлые мужы, што апрача гоману бору, паху красак, усходу сонца і граньня маіх гусьляў бывае часам яшчэ нешта прыгажэйшае, мілейшае гэта—словы чалавека?.. Ага! дык я пабягу па ваду. (выходзе і вяртаецца). Я калі замаруджу, забаўлюся крыху... бо аж у крыніцу па ваду... яна ў нас надзвычайная—лечыць і добрых, і благіх.

Пётра. Дзякуем, мы пакуль што ня хворые. Ці няма тут бліжэй дзе вады?

Гусьляр. Няма. Усюды ўскалмучаная капытамі, пачырванелая ад крыві... (выходзе).

Пётра. Хай бы ён хутчэй—нечага нам загульвацца, бо я ключы ад неба ўзяў... вось яны... А там мо' каму будуць патрэбны. (Чуваць далёкі гром). Ну і што ты робіш, Ільля, зноў грукаціш, стукаеш—тут і так грязёй захліпаешся.

Ільля. Ну, я то ўжо ведаю, што раблю.

Пётра. Але, ты ведаеш. Добра аб табе людзі кажуць: „Ільля наробіць гнільля.“

Ільля. Гэй, там грымі, грамавік; смалі, пярун!

Пётра. Узяць хоць бы надойча: я падмёў, значыць, падмыў неба чысьценька, гладзенька ўсе куточкі; ахутаў зямельку лёгкай сінявой. Усюды парадачак—проста любата. Не! Дык вось трэба было парваць, паглуміць, засьлюнявіць...

Ільля. Грымі там, гагокай, а мацней толькі!

Пётра. Трэба ўсё ткі з людзьмі лічыцца і прыглядацца да іх патрэб. Твярэц ня раз табе казаў: давай дажджаяк, яны просяць, чуеш—просяць, просяць, бо ты не дачуў і даеш, як яны косяць.

Ільля. Ах пакінь ты, піла тупая. Ось як пачне скрыпець, дык аж мяне бярэ ахвота раскумякаць табе, што ты круглы дурань вось як! Бо ты, напрыклад, кажаш з людзьмі мяркавацца. Добра! Але колькі-ж разоў ты, дабрадзеец, пёк іх бязлітасна пр[illegible] постаці, пакосе, паліў іхні ўраджай, сушыў іхняе поле. А?

Пётра. Ды, паміж намі кажучы, людзям не дагодзіш—дакучлівые стварэньні.

Ільля. Во! так і кажы. А то-завёў... Па іх сьцежках небясьпечна хадзіць—як відзіш галаву скруціш. Але ўсё ткі іх душы шмат узбагацелі посьле Хрыста.

Пётра. Ты Ільля, ня толькі глухі, але і сьляпы. „Ўзбагацелі...“ Глянь, вунь, на тых двух шчапіўшыхся мерцьвякоў.

Ільля. (уздрыгваючыся). Вух! Плюгаўства, агіднікі, самі сябе жруць...

Пётра. (адварочваецца). Мне муторна...

Ільля. Уцячом!..

Пётра. Мы, калі куды прыходзім, дык не таго, каб адтуль уцякаць. Я, бачыш, хачу сказаць, што тут Хрыста яшчэ ня знаюць і што пазнаўшы яго... Эх ведаеш, Ільля, спудлаваў наш вучыцель, што не адучыў людзей мсціцца!

Ільля. Ён-бы шмат чаго навучыў, але яны самі не захацелі.

Пётра. Ды яно заўсёды так—за добрае злым заплата.

Ільля. Не заўсёды! Не дарма Хрыстос так палюбіў людзей і так шмат ад іх спадзяваўся. Нешта ёсьць такое.

Пётра. Вось і я аб гэтым часамі мяркую. Возьмем сабе таго крывічаніна—ён асаблівы.

Ільля. Во, во ён, мне да ўспадобы,—такі цікавы, сьветазарны. Я ўжо разважаю, чым яму даказаць нашу прыхільнасьць, спагаду. Я дык даў-бы яму краску папараці.

Пётра. Ну, гэта небясьпечна!

Ільля. То паправім яму гусьлі і дамо ім вялікую моц.

Пётра. Ды не, за шмат!

Ільля. Пётра, будзь сябрам, зрабі! Мы не ашукаліся—тут, бачыш, уся старонка—добры грунт для нас. Яе маўчалівая трывога, халодная развага абяцаюць цікавую разгадку.

Пётра. (Папраўляючы гусьлі). Каб яно ня вышла так, што абяцанкі, цацанкі, а дурному радасьць.

Гусьляр—(рупна ўходзе). Выбачайце, замарудзіў... Ух, замарыўся... Вось вам вадзіцы.

Пётра. А табе гусьлі... Пакуль ты схадзіў па ваду, дык мы табе іх паправілі.

Ільля. Ха-ха-ха... ня верыць! Ты вазьмі іх на рукі, крані струны...

Гусьляр. Гусьлі... мае гусьлі... паправілі... І добра паправілі ? (кратае струны).

Ільля. Ну, а як ты думаеш? (Сьмяецца).

Пётра. Гм... „Ці добра паправілі“...“

Гусьляр. Гамоняць, гулуць чароўные, жывуць і сіратлівую душу маю радуюць, акрыляюць. І ня ўстрымаць мне сваіх пальцаў, і не ўцягчы вам, галасістые, чулые струны. О, вясёлая навіна!

Пётра. Лійся жа, песьня, па горах, долах, лясох.. Будзі, ядная, саграваі каханьнем. Ажыўляй памёршых. Лунай, песьня, ў паднябесьсі, сьпявай хвалу сьвету.

Ільля. Справядліва! Так быць павінна!

Пётра. Бачыш, Ільля, месяц ужо выплыў, дык павідну пасунемся.

Ільля. Ну, што ж, то і пасунемся.

Пётра пашоў, а Ільля стаяў і з любосьцяй глядзеў, як гусьляр наладжываў гусьлі. І калі ўпарадкаваные струны зайгралі, зьліваючыся ў гармонійные тоны, то Ільля, ужо адходзячы, пацалаваў гусьляра ў галаву і сказаў: „Люб ты мне!“ Але гусьляр замоцна быў заняты, каб зьвярнуць на гэта увагу. Ён у той час праз гусьлі з небам гукаў. Яго граньнё (о, чароўные гусьлі!) ажывіло, прабудзіло Ламізялезо, Вярнігору Вырвідуб і іншых—яны падымаюцца, хватаюцца за аружжо і паюць:

Гэй, схамяніцеся ад сну—
Пара, пара нам уставаць!
Ад ворага ліхога сьлед,
Сьлед помсты просіць нас.
Дык хто устаў аружжо ладзь
І будзь гатоў на кліч, на збор.
Мы, як арлы тых груганоў,
Разгонім ворагаў сваіх
Дакажам ім, навучым іх,
Што грозны і бязсьмертны мы,
Што моц—магучы волат ёсьць
З нас кожны целам і душой!
А ты, гультай, забаўку кінь,
Нашоў калі і дзе іграць.
Жыцьцё—змаганьне, дык за край
І за жыцьцё у бітву йдзём.
Аднаць трэ' гусьлі у яго
І даць атручаные стрэлы,
Лук пругкі...

Л. Родзевіч.

дапаможа вучням у іх далейшым разьвіцьці адчыненьнем курсаў і інш.

Ад настаўнікаў прамову меў Шпаркевіч. Ён зазначыў, пры якіх абстовінах вялася навука вучняў праз 4 гады і, закончыў прамову поклічам—быць дастойнымі грамадзянамі сваей бацькаўшчыны.

Шэф Сэкцыі Асьветы пры магістрацe Паўлюц адзначыў у сваей прамове, што польскі жаўнер прышоў у гэты край не звяваць яго, а вызваліць яго ад ярма няволі і дапамагчы яму ў культурным разьвіцьці. Далей ён зычыў беларускай культуры роўнага разьвіцьця з культурай польскай.

Потым былі агалошаны сьпісы скончыўшых школу вучняў і раздавы ім пасьведчаньні і кніжкі ў падарунак.

На закончэньне акту слова меў А. Смоліч. Ён сказаў, што імя „маладога беларускага грамадзяніна" абавязуе ісьці ў народ і дапамагчы яму скінуць з сябе ярмо вяковай крыўды і няволі.

Паміж прамоўцамі пяў беларускі хор. Скончыўшым школы было запрапанавана пайці ў гарадзкі тэатр на беларускі спэктакль, які адбыўся ўвечары ў той-жа дзень.

Падаў **С. Кот.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЬЦЕ.

Адрэс мястовай рады гэн. Шэптыцкаму. 16-га чэрвеня делегацыя мястовай думы паднясла гэн. Шэптыцкаму адрэс вось якога зьместу: „Менская мястовая рада на пасяджэньні 10 га чэрвеня г. г. бяручы пад увагу загад камандзіра фронту гэнэрала Шэптыцкага аб тым, што небясьпека, каторая пагражала нашаму гораду ад бальшавіцкіх орд зьліквідавана, складае шчырае падзякаваньне і ўшанаваньне нашаму багатырскаму войску з камандзірам фронту гэнэралам Шэптыцкім на чале."

Выплата мястовых налогаў ідзець вельмі слаба.

Тэлеграф зноў пачаў функцыянаваць нормальна. Прыймаюцца прыватные тэлеграмы. Тэлеграмы з Варшавы прыбываюць праз 2—3 гадзіны.

У жыдоўскай абшчыне сягоньня, 20 га чэрвеня, адбудзецца чарговае пасяджэньне, дзеля разгляду розных спраў.

У мястовым т-ве ўзаемнай страхоўкі ад агню. Сягоньня, 20 га чэрвеня, адбудзецца сход членаў у шляхецкім доме, дзеля разгляду справаздачы за мінулые 2 гады, каштарысу на 1920 год і інш.

Скарбонаачны збор „Крэсы Крэсам," паводлуг загаду плебісцытнага камітэту, адбудзецца сягоньня, 20 га чэрвеня, ў Менску і паветах.

У цэнтральным саюзе сельскай гаспадаркі склады і крамы папаўняюцца рознымі таварамі.

Тавар гэты ўжо выдаецца сельскім коопэратывам.

Коопэратыў „Менскага спажыўнага саюзу чыноўнікаў" разьвівае сваю працу. Гэтымі днямі там адтрымана партыя цукру, каторы прадаецца пайшчыкам па 28 мар. за фунт. Так сама коопэратыў выдае хлеб па 3½ маркі за фунт.

У вольна пажарным т-ве заўтра, 21-га чэрвеня, прымуць у дружыну новых ахвотнікаў з тых, што падавалі заявы ў апошні час.

У ноч з 16 на 17 чэрвеня зробленая ў вольна-пажарным т-ве ўладаю трывога сабрала дзяжурных (18 чал.) праз 5 мінут.

У „Земкоопэратыве" масло прадаецца па 63 маркі за фунт, сыр—18 марак фунт.

Бульба патанела ў прыватнай прадажы да 1 мар. за фунт.

На біржы ўчора давалі:

за	500 руб. цар. —	1372	польск.	мар.
„	1000 руб. дум. —	610	„	„
„	100 мар. ням. —	405	„	„
„	1 франк —	1½	„	„
„	1 фунт. ст. —	660	„	„
„	1 доляр —	158	„	„

Беларускі тэатр.

Напамінаем чытачом, што ў нядзелю 20 чэрвеня адбудзецца беларускі спэктакль у Гарадзкім Тэатры. Будзе пастаўлена „Сягоньняшняе і Даўнейшае" К. Буйло і „Рысь" з удзелам хору Тэраўскага. Пастаноўка пры новых дэкарацыях і сьветавых эфэктах.

Рэдактар—Я. ЛЁСІК.

Выдавец—К. ТАРЭШЧАНКА.

КИНЕМАТОГРАФ
„МОДЕРН"
Францишканская ул.

КИНЕМАТОГРАФ
„ИЛЛЮЗИОН"
Мицкевича ул.

Хто мае

вальцы да выврабу штучнай вашчыны, альбо вашчыну, прашу тэрмінова даць вестку аб гэтым у рэдакцыю „Беларусь". **Шарамэт.** 426

Всем и повсюду известная
ХИРОМАНТКА
мисс Борщова,
которая предсказывает с линии рук, зеркала, наружности человека, характер, болезни, кражи, любовь и путешествие, об'ясняет сны и предсказывает НАСТОЯЩЕЕ, ПРОШЛОЕ и БУДУЩЕЕ.
Пусть всякий поспешит по адресу. Минск, уг. Крещенской и Полицейской, д. Іоселевича, рядом с баней Плавского № 21—24, кв. № 2. 283

—) Выдавецкі аддзел (—
БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЬНАЙ РАДЫ
знаходзіцца па Койдакаускай вул. № 21, кв. 4. Чыннасьць ад 9—3 гадз. 423

Агульная малочная
Дамініканская 3.
мае сьвежае аналізаванае прападжанае праз фільтр-Уляндэра малако і інш. малочные прадукты. 417

Язэп Зальцман Зборавая (Праабраж.) № 15.
КАНТОРА АБМЕНУ ВАЛЮТ
купля і прадажа працэнтных папераў. 413

KRYNICA ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ТЫДНЕВАЯ ГАЗЭТА
„Krynica" каштуе: на год . . . 40 мар.; на 3 месяцы. 10 „; асобны нумар 1 „
Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Сьв.-Янская вул., дом пры Касьцеле сьв. Яна 2. 411

Покупаю по высокой цене
старинные вещи
картины, гравюры, миниатюры, гобелены, ковры, фарфор, платиновые монеты, стекло, бронзу, меха, мебель и др.
Ш. М. Рапопорт,
Ул. Мицкевича (Захарьевская) № 45. 409.

Мяняльная кантора
Н. Гальперына, Н. Ідэльчыка і Ко
Койдаваўская 22.
Купля і прадажа розных валют.
№ 404.

Незалежная Думка
політычна-грамадзянская і літэратурная часопісь.
Выходзіць у Вільні што тыдзень.
Рэдактар—Г. Багдановіч.
Выдавец—У. Знамяроўскі.
Рэдакцыя і адміністрацыя: *Вострабрамская 9—5.*
Асобны нумар **2 мар.**, на 1 год **100 мк.**, на 6 месяцаў **50 мк.**, на 3 мес. **25 мк.**, на 1 мес. **8 мар.**

Украдзены дакумэнты: пашпарт, выд. Заслаўскім вал. праўл., білет воінскага начальніка, асабістае пасьведчаньне, выд. начальнікам Лібава-Роменскага тэлеграфу на імя **Саукі Бурэйкі**, каторые прашу лічыць нядзейснымі. 429

СЕГОДНЯ ПЕРВАЯ СЕРИЯ.
„Клуб Желтаго Треугольника."
Грандиознейшая драма в 4-х сериях 24 х частях 8000 метров.

Борьба женщин
или Триумф Счастья — драма в 5 частях.
Сверх программы АВТОМОБИЛЬНЫЕ ГОНКИ В ПАРЫЖЕ.

ПЕРВАЯ РУССКАЯ ХЛЕБОПЕКАРНЯ
С. О. Мигуцкаго и Ко бывш. Штакеля.
Минск, Ново-Московский пер. д. Залкинда прот. № 4.
ПРИНИМАЕТ ЗАКАЗЫ. ПОДРЯДЫ от войсковых частей, учреждений и кооперативов на выпечку ХЛЕБА и БУЛОК. Там же розничная продажа хлеба
ЦЕНЫ и КАЧЕСТВО ХЛЕБА ВНЕ КОНКУРРЕНЦИИ. 302

ГДЗЕ ВЕСЕЛА І ВАЛЬГОТНА ПАСЯДЗЕЦЬ?
ПЭЎНЯ Ж У РЭСТАРАНЕ ПАВІЛЬЁНЕ НА ГАРАДЗКІМ СКВЕРЫ.
У цяні дрэў, пад шатамі пахучага бэзу можна
Смачна пасьнедаць,
Сытна паабедаць,
добра павячэраць.
Зыкі чаруючага аркестру песьцяць слух.
ПАХУЧАЯ ГЭРБАТА, СМАЧНАЯ КАВА, НАТУРАЛЬНАЯ ЧАКАЛЯДА І КАКАО.
Размаітые закускі Найлепшые трубкі. Найлепшая правізія.
ТАННА, ПРЫТУЛЬНА, ВЕСЕЛА. 407

МИНСКАЯ ФЕЛЬДШЕРСКО-АКУШЕРСКАЯ ШКОЛА
ул. Мицкевича (Захарьевская) 31 кв. 4.
Открыт прием на годичный курс акушерскаго отделения 2-го разряда.
ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ ЦЕНЗ НЕ ОБЯЗАТЕЛЕН.
Плата для акушерскаго отделения понижена.
Прошения и справки от 11 до 1 ч. дня. 262.

Прымаюцца хутры на летняе перахаваньне.
КУПЛЯЕМ УСЯЛЯКІЕ **ХУТРЫ,**
ПЛАЦІМ НАЙЛЕПШЫЕ ЦЭНЫ.
СКЛАД ХУТРАЎ **Г. Офэнгэндэн і Х. Яноўскі,**
Францішканская (Губэрнатарская) № 1, дом готэль Эўропа. 216
Прымаюцца хутры на летняе перахаваньне.
Перашыўкі. Перашыўкі.

Саюз Злучаных Коопэратываў.
Праўленьне (Катэдральны пляц, д. № 2. б. Іоллоса) падае да ведаму пайшчыкаў і грамадзян, што ва ўсе 13 крам коопэратыву з **16 г. м.** штадня дастаўляецца хлеб для прадажы.
Хлеб пячэцца ва ўласнай пякарні. (Тарасаўская д. Марголіна) і прыгатаўляецца з чыстай жытнай мукі (бяз ніякіх дамешак) у гігіенічна абстаўленым памяшканьні. 428

У коопэратыве „ЗЛУЧНАСЬЦЬ"
ПРАДАЮЦЦА ВОСЬ ЯКІЕ КНІГІ:
1. Беларускі слоўнік—*Насовіча.*
2. Этнаграфічные зборнікі—*Шэйна.*
3. Беларусы-Сакуны—*Сербава,* 425

РУНЬ

Ад 1 мая г. г. у Менску выходзіць новая часопісь.

Рунь *беларускае літэратуры і мастацтва.*
Рунь у ліку сваіх супрацоўнікаў мае самые найпаважнейшые літэратурные і мастацкіе сілы.
Рунь захоплівае сваім зьместам беларускае пісьменство, поэзію, гісторыю, памяткі мінуўшчыны, крытыку і г. д.
Рунь служыць вялікім ідэалам красы і свабоды.
Рунь выходзіць ня меней 4-х разоў у месяць.
Рунь каштуе з перасылкай толькі 5 марак за адзін нумар, (двайны нумар 10 м.), на 1 м-ц. — 20 мар., на 3 мес. — 60 мар.
Рунь выходзіць пад рэдакцыяй Янкі Луцэвіча, выдавец проф. Вацлаў Іваноўскі.
Адрэс: Рэдакцыя—Менск, Кашарская 10, кв. 5, (адчын. ад 10 да 11 г. зр.).
Адміністрацыя: вул. Міцкевіча, Беларускі Дом (адчын. ад 9 да 3 г. дня). 293

З дазв. вайсков. цэнзуры № 512, 19 VI.

Менск. Друкарня Інвалідаў.